Выпуск 15 / Верасень 2022

Дасылайце, калі ласка, інфармацыю пра ўсё, што тычыцца адукацыі беларусаў, у наш бяспечны і ананімны чат-бот @eduOST_bot . Паведамляйце нам навіны са сваёй установы адукацыі ці дзяржаўнага ведамства датычна рэпрэсій і розных форм ціску з боку кіраўніцтва, пішыце нам пра факты карупцыі і новыя распараджэнні, якія здаюцца вам неабгрунтаванымі ці нерацыянальнымі. Таксама запрашаем вас дзяліцца сваімі ідэямі і прапановамі па рэфармаванні сістэмы адукацыі.

У нас з’явіўся сайт www.asvetaby.org, дзе можна знайсці ўсе выпускі дайджэсту “Асвета” на беларускай, рускай і англійскай мовах.

## РЭПРЭСІІ

У сувязі са здарэннем каля прыватнай школы “Смарт Скул“, дзе вучань выстраліў у твар аднакласніцы з пнеўматычнага пісталета, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што, па яго інфармацыі, кіраўніцтва школы “на дух не трывае беларускую дзяржаву“. Вядома, што пасля здарэння на дырэктарку школы Наталлю Базанаву была заведзеная крымінальная справа па частцы 2 артыкула 424 КК (злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі), што прадугледжвае пакаранне пазбаўленнем волі тэрмінам ад двух да шасці гадоў. Таксама быў затрыманы адзін з настаўнікаў – вядомы дзіцячы паэт, актор Дзмітрый Юртаеў. “Пакаяльнае“ відэа, дзе ён сцвярджае, што ўдзельнічаў у акцыях пратэсту ў 2020 г., было апублікаванае ў адным з праўладных Тэлеграм-каналаў, аўтары якога абвінавачваюць мужчыну ва “ўдзеле ў беспарадках, абразе службовых асобаў, распальванні нянавісці“.

21 верасня 21-гадовага студэнта 4 курса гістарычнага факультэта БДПУ Мацвея Гранкевіча асудзілі на 2 гады і 2 месяцы пазбаўлення волі. Прысуд быў вынесены ў Мінскім гарадскім судзе суддзёй Наталляй Бугук на падставе абвінавачання па ч. 1 арт. 342 (удзел у дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак) і ч. 1 арт. 130 (распальванне іншай сацыяльнай варожасці). Напярэдадні вынясення прысуду юнак быў унесены КДБ у спіс асобаў, “датычных да тэрарыстычнай дзейнасці“. У чаканні суда ён правёў 11 месяцаў у зняволенні. Вядома, што ў 2020 г. хлопца затрымлівалі за ўдзел у акцыі пратэсту, а перад адкрыццём крымінальнай справы восенню 2021 г. яго затрымалі прама ў дэканаце, апазнаўшы па фотаздымку з пратэстнай акцыі.

5 верасня быў затрыманы малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі Аляксандр Кандрацюк. У судзе Першамайскага раёна г. Мінска ён быў асуджаны на 13 сутак адміністрацыйнага арышту, але яшчэ да сканчэння тэрміна яму прад'явілі новае абвінавачанне па артыкуле 130 КК (распальванне расавай, нацыянальнай ці рэлігійнай варожасці). Мяркуецца, што прычынай затрымання стала датычнасць супрацоўніка да дзейнасці незалежнага прафсаюза.

14 верасня былі затрыманыя два супрацоўнікі Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі. Вядома, што адзін з іх – Яўген Сысаляцін – застаецца ў зняволенні, з другім супрацоўнікам (імя невядомае) была праведзеная гутарка, запісанае відэа і апублікаванае ў адным з праўладных Тэлеграм-каналаў. Мяркуецца, прычынай затрымання стала датычнасць супрацоўнікаў да дзейнасці незалежнага прафсаюза.

Прыблізна ў канцы верасня быў затрыманы навуковы сакратар Цэнтра сістэмнага аналізу і статэгічных даследаванняў НАН Беларусі, чалец Рады маладых навукоўцаў Алесь Бярнацкі, які ўдзельнічаў у даследаваннях па "зялёнай" энергетыцы. Прычынай затрымання, як мяркуецца, стаў яго ўдзел у акцыі салідарнасці, якая праходзіла каля галоўнага корпуса Акадэміі Навук у жніўні 2020 г. Па інфармацыі праўладнага СМІ, на мужчыну заведзеная крымінальная справа.

Прыкладна ў канцы верасня затрымалі 19-гадовую студэнтку эканамічнага факультэта БДУ Арыну Сянюту за ўдзел у пратэстах 2020 г. Вядома, што ў дзяўчыны, якая вучыцца па спецыяльнасці "менеджмент", высокія балы, яна актыўна ўдзельнічае ў конкурсах і алімпіядах.

Напярэдадні 13 верасня быў затрыманы выпускнік БДУ, кандыдат гістарычных навук Яўген Гурынаў. Паводле відэазапісу, апублікаванага ў адным з праўладных Тэлеграм-каналаў, мужчыну абвінавачваюць ва ўдзеле ў мірных пратэстах, за што на яго заведзеная крымінальная справа.

Былая настаўніца беларускай мовы з г. Мёры, палітзняволеная Эма Сцепулёнак пераведзеная пад хатні арышт. Год таму жанчыну затрымалі па "справе Зельцара" за каментары ў сацсетках, абвінаваціўшы яе па артыкулах 369 КК (абраза прадстаўніка ўлады) і 130 (распальванне сацыяльнай варожасці). За час знаходжання ў зняволенні ў жанчыны істотна пагоршыўся стан здароўя.

18-гадоваму палітзняволенаму Максіму Шатохіну, асуджанаму 12 жніўня 2021 г. суддзём Святаславам Калінам на 3 гады пазбаўлення волі па справе аб масавых беспарадках у Брэсце, змянілі меру пакарання: 20 верасня з папраўчай калоніі №2, куды Максім быў накіраваны, з’яўляючыся непаўнагадовым у момант вынясення прысуду, юнака перавялі на “хатнюю хімію“.

## ПАЛІТЫКА РЭЖЫМА

17 верасня вучняў школаў Беларусі абавязалі напісаць дыктант пра “вызваленчы паход“ Чырвонай Арміі ў 1939 г., тэкст якога ўключаў цытату А. Лукашэнкі з выключна станоўчай ацэнкай гэтай гістарычнай падзеі.

У праграме вывучэння гісторыі Беларусі для 11-х класаў школаў цяпер плануецца больш увагі прысвячаць тэме палітыкі польскіх уладаў у дачыненні да беларусаў Заходняй Беларусі, якая знаходзілася ў складзе Польшчы ў 1921-39 гг. Акрамя таго, чыноўнікі са сферы адукацыі прапануюць запрашаць на ўрокі, прысвечаныя “дню народнага адзінства“ “грамадскіх дзеячаў з рэгіёнаў, якія, можа быць, яшчэ памятаюць тыя падзеі“.

Рэпрэсіі супраць Польскай Адукацыйнай Супольнасці (“Polska Macierz Szkolna“) і польскай школы ў Гродне, якая функцыянавала на яе базе, могуць закончыцца ліквідацыяй гэтай арганізацыі, справу якой разглядае Вярхоўны суд. У 2021 г. беларускія ўлады ўжо прызнавалі арганізацыю вінаватай у “незаконнай дзейнасці ў сферы адукацыі“ і нявыплаце падаткаў, прысуджаючы штрафы на агульную суму 800 000 рублёў.

Тэлеграм-канал “Нашы грошы“ прааналізаваў сітуацыю з настаўніцкім кадравым складам у дзяржаўных школах Беларусі і прыйшоў да высновы, што за апошнія два гады ў Беларусі настолькі істотна знізілася колькасць працаўнікоў у дзяржаўным сектары адукацыі, што абавязковае размеркаванне студэнтаў педагагічных і іншых спецыяльнасцяў, за кошт якога дзяржава традыцыйна вырашала праблему з кадрамі, ужо не можа забяспечыць установы адукацыі патрэбнай колькасцю спецыялістаў: сярэднерэспубліканская розніца паміж колькасцю звольненых і колькасцю прынятых на працу супрацоўнікаў за апошнія два гады складае ў сярэднім 8833 чалавекі.

## ГРАМАДСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ І АДУКАЦЫЯ

У Вільнюсе пачала працу беларуская школа нефармальнай адукацыі. Яе змогуць бясплатна наведваць па выходных дзеці ад 3 да 16 гадоў з беларускіх сем'яў. Арганізатары плануюць навучаць дзяцей беларускай, літоўскай і англійскай мовам, графічнаму дызайну, тэатральнаму мастацтву. Таксама плануюцца заняткі па выяўленчым мастацтве, робататэхніцы, вакальным майстэрстве, экскурсіі і тэматычныя курсы. Акрамя таго, будзе працаваць група для дзяцей з асаблівасцямі развіцця, бацькоўскі клуб, моўныя курсы для дарослых і кансультацыя псіхолага.

Запушчаны новы інфармацыйны Тэлеграм-канал "De Facto. Беларуская навука". Па словах стваральнікаў канала, ён прысвечаны "даследаванням, навінам супольнасці <...> у краіне і за мяжой з фокусам на сацыяльныя і гуманітарныя дысцыпліны". У канале публікуецца інфармацыя пра гранты і стажыроўкі для навукоўцаў, анонсы навуковых канферэнцый і семінараў, меркаванні экспертаў, анонсы новых навуковых публікацый.

Канал для беларускага студэнцтва Суполка.Ву апублікаваў інтэрв'ю з прадстаўніцай Офіса Святланы Ціханоўскай па адукацыі і навуцы Таццянай Шчытцовай, у якім госця распавядае пра кірункі працы сваёй каманды: дапамога рэпрэсаваным студэнтам, выкладчыкам і навукоўцам, падрыхтоўка да рэформы беларускай сістэмы адукацыі і супрацоўніцтва з моладдзю ў гэтай галіне. У інтэрв'ю таксама гаворыцца пра ключавыя праблемы беларускай адукацыі і спосабы іх вырашэння.

Адміністратыўны дырэктар Беларускага цэнтра эканамічных даследаванняў "Вегос" Павал Дайнэка выказаў меркаванне пра значнасць рэформаў, творчасць у сферы адукацыі і дыялогавы падыход у сучасным навучанні: "у машыннай вытворчасці патрэбны токар, які дакладна выконвае інструкцыю <...> У інфармацыйнай супольнасці <...> На першы план выходзіць уменне генераваць інавацыі, а гэта рэалізуецца, у значнай меры, у межах гарызантальных дыялогаў".

## МІЖНАРОДНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Ініцыятыва Філіпа Шварца аб'явіла пра запуск праграмы фінансавай падтрымкі навукоўцаў, якія былі рэпрэсаваныя або знаходзяцца ў небяспецы, тэрмінам ад 2 да 3 гадоў. Сярод патрабаванняў да сушукальнікаў: наяўнасць навуковай

ступені, навуковых публікацый ці іншых навуковых дасягненняў, наяўнасць статусу ўцекача або іншых доказаў праследу сушукальніка ў сваёй краіне. Заяўку на ўдзел у праграме неабходна падаваць ад адной з ВНУ ці акадэмічных установаў Германіі, з якой у сушукальніка папярэдне павінна быць дасягнутая дамоўленасць пра супрацу ў межах дадзенай праграмы. Апошні тэрмін падачы заяўкі – 21 кастрычніка 2022 г.

Фонд “Дом навук аб чалавеку“ і Цэнтр франка-расійскіх даследаванняў аб’явілі конкурс заявак для навукоўцаў на атрыманне стыпендыі тэрмінам ад двух да трох месяцаў для правядзення даследаванняў у галіне гуманітарных і сацыяльных навук. Памер стыпендыі, разлічаны ў т.л. на пакрыццё выдаткаў на пражыванне і дарогу, складае 1600 еўра ў месяц. Таксама выбраным удзельнікам арганізатары абяцаюць дапамагчы з атрыманнем візы, пасудзейнічаць у знаходжанні месца для працы, даць рэкамендацыйныя лісты для працы ў бібліятэках і архівах. Для ўдзелу ў конкурсе неабходна мець ступень кандыдата навук і папярэднюю дамоўленасць з адной з акадэмічных установаў Францыі пра тое, што яна выступіць у ролі боку, які прымае, на перыяд правядзення даследавання. Апошні тэрмін падачы заявак – 9 снежня 2022 г.

Федэральнае міністэрства замежных справаў Германі аб’явіла пра конкурс заявак на атрыманне гранта ў межах праграмы “Пашырэння супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасцю краінаў Усходняга партнёрства і Расіі“. Гранты будуць надавацца недзяржаўным і некамерцыйным арганізацыям, а таксама асобам, дзейнасць якіх была накіраваная на барацьбу з дэзінфармацыяй, умацаванне грамадзянскай супольнасці, наладжванне сувязяў паміж супольнасцю палітычных мігрантаў і грамадствам боку, які іх прымае, падтрымку жанчын, абарону клімата, развіццё культурных і адукацыйных сувязяў паміж моладдзю з краінаў Усходняга партнёрства і іншыя ініцыятывы. Асаблівасцю конкурса з’яўляецца тое, што ў ім могуць удзельнічаць праекты і арганізацыі, якія знаходзяцца ў часовай эміграцыі і дзейнічаюць на карысць беларусаў, якія пражываюць за межамі сваёй краіны. Для выбраных праектаў будуць выдзеленыя гранты ў памеры ад 50 000 еўра. Прыём заявак – з 20 верасня да 21 кастрычніка.

Цэнтр “EducationUSA“ запрашае студэнтаў з Беларусі, якія хочуць навучацца ў ЗША ў магістратуры або дактарантуры, на бясплатны 5-месячны анлайн-курс падрыхтоўкі да паступлення Graduate Student Advising Program (GSAP). Найбольш паспяховыя слухачы курса атрымаюць магчымасць бясплатнага праходжання тэстаў, неабходных для паступлення ў ВНУ і акадэмічныя ўстановы

ЗША. Таксама такім сушукальнікам будзе аддадзеная перавага пры разглядзе іх заяўкі на ўдзел у праграме “Opportunity“, якая прадугледжвае фінансавую падтрымку ўрада ЗША для паступлення.

Для беларускіх навукоўцаў са ступенню магістра, кандыдата ці доктара навук адкрытая магчымасць атрымання стыпендыі ўрада Швейцарыі тэрмінам на 1 год, якая складзе ад 1920 да 3500 швейцарскіх франкаў у месяц у залежнасці ад віду праграмы. Пачатак праграмы – 1 верасня 2023 года. Апошні тэрмін падачы заявак – 9 снежня 2022 г.

Стакгольмскі ўніверсітэт аб’явіў набор на дактаранцкія праграмы па цэлым шэрагу кірункаў і дысцыплінаў: ад даследаванняў кіно да камп’ютарных навук. Падрабязней пра праграмы і ўмовы прыёму можна даведацца на сайце ўніверсітэта. Апошні тэрмін падачы дакументаў – 1/6/15.10.2022 (у залежнасці ад спецыяльнасці).